СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛІСТАПАДА 2015 г. АЎТОРАК № 212 (28070) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Іх першы і апошні бой



Складанасці інтэграцыі



Пляцоўка для творчасці

# САМЫ ЛЕПШЫ ДЗЕНЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лагойск. Рафал ЗАГОРСКІ забірае з раддома жонку Марыю і дачушку Агату.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ян ЧУЛ КІМ, кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі:**

*«За апошнія дзесяць месяцаў мы назіраем дастаткова паслядоўную грашова-крэдытную палітыку, што праводзіцца Нацыянальным банкам. Мы ў гэты перыяд не назіралі раней характэрнага пашырэння грашовай масы, Нацбанк працягвае выконваць палітыку таргетавання інфляцыі і, наколькі мы бачым, мае намер і ў далейшым яе прытрымлівацца, таму рэзкага скачка цэн і росту інфляцыі не чакаецца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17421,00 | ▼ |
| Еўра | 19225,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 273,04 | ▲ |
| Укр. грыўня | 757,43 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Сацыяльны клопат

## ПРЫЁМНЫЯ БАЦЬКІ ДЛЯ ПАЖЫЛЫХ

### Як чужыя сем'і дапамагаюць пенсіянерам

**Штогод сацыяльныя службы абследуюць умовы жыцця адзінокіх пажылых людзей. Выдаткоўваюць ім сродкі на рамонт печаў, электраправодкі, сантэхнікі. Але калі ў чалавека няма сіл падпаліць у печы і прынесці вады ў хату, то нават у дагледжаным доме яму без падтрымкі будзе складана. Каб дапамагчы пенсіянерам, асобныя сем'і згаджаюцца забраць адзінокіх да сябе. Бадай, адным з найпершых раёнаў, які падтрымаў ініцыятыву, стаў Вілейскі, дзе чатыры гады таму з'явіліся прыёмныя сем'і ў Даўгінаўскім і Нарачанскім сельсаветах. Як арганізавана гэтая форма пражывання? Па адказ едзем на Вілейшчыну.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Сям'я БАРАВЫХ — Ірына Генрыхаўна і Анатоль Іванавіч — з цеплынёй ставяцца да сваёй бабулі.

### Адносіны па дагаворы

— Думалі спачатку, што адзінокіх старых будуць прымаць толькі на ацяпляльны перыяд, — расказвае **загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Вілейскага тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва Данута РАМАНОЎСКАЯ.** — Але ж чалавек з часам не маладзее, хату дагледзець усё складаней, таму сем'і вырашылі пакідаць падапечных у сябе на цэлы год. Хтосьці бярэ ў дом родзічаў, напрыклад, цётку, іншыя — суседзяў, якіх даўно ведаюць.

Прыёмных сем'яў у раёне сёння сем. Такая форма ўладкавання пенсіянераў прадугледжвае сумеснае пражыванне і вядзенне агульнай гаспадаркі.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## ЦЁПЛА, АЛЕ ВІЛЬГОТНА

### Сярэдні тэмпературны фон будзе на 2-7 градусаў вышэйшым за норму

**У першы тыдзень лістапада паветра з Атлантыкі прынясе на тэрыторыю краіны сапраўды цёплае, але з туманамі і больш сырое надвор'е. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Менавіта ў першай палове тыдня на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў вільготнай паветранай масе. Сёння ў асобных раёнах пройдуць невялікія дажджы. Месцамі магчымы туман. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 7-13 цяпла. А вось у сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, пры праясненнях да 2 марозу, удзень — 7-13 цяпла. Аднак у чацвер надвор'е пачне вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў больш халодным паветры. Ападкаў пераважна не будзе, але месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, па паўночным усходзе — да плюс 5 градусаў, удзень — 4-10 цяпла.

Малаактыўны атмасферны фронт прыйдзе да нас у пятніцу. Тады ўначы будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — 3-9 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

# ПАДАТКІ — ГЭТА ДЗЯРЖАВА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае неабходнасць захавання стабільнасці падатковай сістэмы краіны. Такую задачу ён паставіў на нарадзе па ўдасканаленні асобных пытанняў падаткаабкладання і спагнання арэнднай платы за зямельныя ўчасткі.**

На разгляд кіраўніка дзяржавы ўнесены праекты ўказаў, якія датычацца прывядзення ў адпаведнасць з Падатковым кодэксам, які ўступіў у сілу з 1 студзеня, асобных нарматыўна-прававых актаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Папраўкі закранаюць у асноўным арэндную плату за зямельныя ўчасткі і некаторыя адміністрацыйныя працэдуры, у прыватнасці спагнанне дзяржпошлін, патэнтныя пошліны, консульскія зборы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сістэма падаткаабкладання не можа быць застылай. «Вядома, калі гэтая сістэма, аптымізуючыся, падаткі памяншае, усе апладзіруюць, усе рады, — адзначыў Прэзідэнт. — Мала хто сёння думае пра тое, што падаткі — гэта ў першую чаргу дзяржава і стан гэтай дзяржавы, дзяржаўныя служачыя, урачы, настаўнікі, тыя, хто забяспечвае абарону, бяспеку».

Разам з тым Прэзідэнт падкрэсліў, што падатковая сістэма павінна быць максімальна стабільнай. «Мы абяцалі людзям, што, прынамсі, на працягу фінансавага года нам чапаць сістэму падаткаабкладання нельга, а лепш пакінуць на працягу пяці гадоў усё нязменным, наколькі гэта магчыма, падчысціўшы дзесьці», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што гаворка павінна ісці, асабліва ў нялросты крызісны перыяд, не пра нейкія маштабныя новаўвядзенні і ўзняцце падаткаў, а пра «падчыстку».

Па выніках нарады кіраўнік дзяржавы ўхваліў прадстаўленыя яму на разгляд дакументы, даручыўшы ажыццявіць невялікую дапрацоўку з улікам праведзенага абмеркавання і ў найбліжэйшы час унесці яму на падпісанне.

Змены, якія ўносяцца, маюць тэхнічны характар і не будуць закранаць і пагаршаць становішча падаткаплацельшчыкаў.

**ПРАМАЯ ЛІНІЯ**

## УСЁ АБ ЗАНЯТАСЦІ І АПЛАЦЕ ПРАЦЫ

Хто можа быць зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага? Як беспрацоўнаму прайсці перападрыхтоўку і павысіць сваю кваліфікацыю? Ці мае ён права на стыпендыю падчас навучання па накіраванні органаў дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва? У якія тэрміны наймальнікі павінны паведаміць у службу занятасці аб свабоднай вакансіі? Што такое аплачваемыя грамадскія работы? Як працаўладкавацца інваліду?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць **першаму намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэю Валянцінавічу ЛАБОВІЧУ** падчас прамой лініі «Усё аб занятасці і аплаце працы», якая пройдзе **5 лістапада з 11 да 12 гадзін.**

Задаць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефоне: **8 (017) 309-93-33.** Папярэдне пытанні можна задаць у рабочы час па тэлефоне: **8 (017) 287 18 29.**

# ХТО ЯНЫ, ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ МІНШЧЫНЫ

Трое новых ганаровых грамадзян з'явілася ў Мінскай вобласці. Гэтага звання ўдастоены паэт Сяргей Давідовіч — чалавек шматграннага таленту. Яго работы выстаўлены ў галерэі Лагойска, а таксама падораны гораду. За плячыма майстра 40 персанальных выстаў як у Беларусі, так і па-за яе межамі. Сяргей Давідовіч — аўтар зборнікаў паэзіі і прозы. Многія яго вершы пакладзены кампазітарамі на музыку. Яго пяру належыць тэкст гімна Лагойска. Акрамя таго, ён рэалізаваў сябе і як сцэнарыст.

У спісе ганаровых грамадзян таксама ветэраны сельгасвытворчасці. Мікалай Васілевіч больш як трыццаць гадоў узначальваў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Лучнікі» Слуцкага раёна. Ён заслужаны работнік сельскай гаспадаркі СССР, узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Леніна і Айчыны III ступені. Менавіта пад яго кіраўніцтвам гаспадарка дасягнула значных поспехаў ва ўсіх галінах вытворчасці. Зінаіда Ярашэвіч — брыгадзір малочнатаварнай фермы «Пагарэлае» адкрытага акцыянернага таварыства «Радзіма Якуба Коласа» Стаўбцоўскага раёна. У гаспадарцы яна працуе ўжо 50 гадоў. У 1988 годзе жанчыне прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Цырымонія ўзнагароджання, уручэння пасведчанняў і стужак адбудзецца падчас абласнога свята «Дажынкі» ў Вілейцы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Не прапусці!

# КАР'ЕРНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**«Дзень кар'еры — восень 2015» пройдзе 5 лістапада ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пачатак у 10.30. Прыйсці на «Дзень кар'еры» могуць студэнты як БДУ, так і іншых сталічных ВНУ.**

У галоўным корпусе ўніверсітэта будуць размешчаны інфармацыйныя стэнды каля дваццаці айчынных і замежных прадпрыемстваў розных сфер дзейнасці. Суіскальнікі атрымаюць інфармацыю аб наяўных вакансіях, варыянтах першага працоўнага месца, падпрацоўкі, стажыроўкі і практыкі з далейшым працаўладкаваннем. Ахвотным будзе прадастаўлена магчымасць гутаркі з патэнцыяльнымі працадаўцамі.

Акрамя гэтага, студэнты сустрэнуцца з вядомымі людзьмі, у тым ліку з выпускнікамі БДУ, абмяркуюць з імі актуальныя пытанні па працаўладкаванні і адаптацыі на першым працоўным месцы. Госці падзеляцца са студэнцкай моладдзю парадамі па пабудове паспяховай кар'еры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Макраэканоміка

# ТРАПІЦЬ У «ХВАЛЮ»

**Беларускія навукоўцы прыйшлі да думкі, што ў найбліжэйшыя 20 гадоў машынабудаванне ўжо не будзе адной з асноўных прыбытковых галін краіны. Згодна з шостым тэхналагічным укладам, які павінен уступіць у сілу ўжо ў 2018 годзе, для Беларусі большае значэнне будуць мець нанатэхналогіі, найперш у ахове здароўя, сельскай гаспадарцы, адукацыі, хіміка-металургічным комплексе. І, дарэчы, у гэтых напрамках некаторыя прадпрыемствы развіваюцца ўжо зараз.**




## ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ КЛАСТАРЫ

**Загадчыца кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, доктар эканамічных навук, прафесар Ірына НОВІКАВА** лічыць, што каб паспяхова працаваць на глабальным рынку, неабходна стаць часткай геаэканомікі. У прынятай Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця вызначана, што Беларусь павінна пераходзіць да постіндустрыяльнай эканомікі, заснаванай на ведах і інавацыях.

«У шэрагу краін ужо адбыўся пераход ад індустрыяльнай да постіндустрыяльнай эканомікі, ад капіталістычнай да посткапіталістычнай сістэмы. Што самае важнае — пераход да новай кардынацыі дзейнасці эканамічных суб'ектаў. Хутка яна не будзе будавацца па рынкавай іерархіі, а абудзецца пераход да кластарна-сеткавай формы эканамічнага развіцця. Айчынныя навукоўцы вывучаюць досвед розных краін па стварэнні перспектыўных кластараў у эканоміцы», — падкрэсліла Ірына Новікава.

Пад кластарам маюцца на ўвазе геаграфічна суседнія ўзаемазвязаныя кампаніі, якія працуюць сумесна з мэтай атрымання канкурэнтных пераваг, стварэння навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі. Да гэтай мадэлі многія транснацыянальныя кампаніі пераходзяць ужо сёння. Прычым такім чынам яны прасоўваюць і палітычныя інтарэсы сваіх краін на сусветным рынку.

## БЫЦЬ У ТРЭНДЗЕ

Канчатковай мэтай глабалізацыі з'яўляецца стварэнне адзінай сеткавай эканомікі — геаэканомікі. Геаэканамічная сетка ў пэўным сэнсе ўжо склалася. Краіны, якія займаюць першыя пазіцыі ў распрацоўцы высокіх тэхналогій, сёння працягваюць затрачваць вялікія сродкі на навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія распрацоўкі. Згодна з інфармацыяй брытанскай статыстыкі па выдатках на іх у розных частках свету, можна сказаць, што, напрыклад, ЗША сумесна з Канадай выдаткоўваюць 34% бюджэту, Еўропа 25% бюджэту, каля 30% — Паўднёва-Усходняя Азія. Цэнтральная Азія, куды адносяць і Расію, — толькі 2,6%.

«Транснацыянальныя кампаніі размяшчаюць свае філіялы высокатэхналагічных распрацовак за мяжой. Еўрапейскія кампаніі ствараюць іх у ЗША, ЗША ў Еўропе. І працэс гэты набірае абароты. Калі фінансавыя сродкі, якія выдаткоўваюцца амерыканскімі кампаніямі, у 1998 годзе складалі 10 млрд долараў, то на 2008 год — 24 млрд долараў. У Еўропе ў 1998 годзе было 16 млрд долараў, у 2008-м гэтая лічба склала больш за 30 млрд», — патлумачыла Ірына Новікава.

З 2018-2020 гадоў пачнецца новая тэхналагічная «хваля». Нам варта трапіць у яе, каб у далейшым адаптавацца да геаэканомікі, якая цяпер складваецца.

## ФАВАРЫТЫ ШОСТАГА ЎКЛАДУ

Як вядома, у 2014 годзе была прынята пастанова Савета Міністраў аб тым, што ў Беларусі будуць фарміравацца інавацыйна-прамысловыя кластары.

«Гэта спроба захаваць нашу прамысловасць. Галіну неабходна захаваць на найбліжэйшую перспектыву і ўкараняць новыя распрацоўкі», — кажа Ірына Новікава. Гаворачы аб шостым тэхналагічным укладзе, варта адзначыць такія перспектыўныя кірункі, як нанаэлектроніка, наноструктураваныя матэрыялы, малекулярная і нанафатоніка, аптычныя нанаматэрыялы. Гэтыя распрацоўкі будуць распаўсюджвацца ў першую чаргу на ахову здароўя, сельскую гаспадарку, адукацыю, хіміка-металургічны комплекс, атамную, сонечную і вадародную энергію, будаўніцтва. Акрамя гэтага, кластар, які працуе ў шостым тэхналагічным укладзе, павінен быць не тэрытарыяльным, а сеткавым, калі прадпрыемствы могуць знаходзіцца ў розных канцах краіны і нават свету. Пры гэтым важную ролю адыгрывае і дзяржаўна-прыватнае партнёрства, і дзяржпадтрымка. Інавацыі павінны стаць адкрытымі, калі можна будзе прыцягваць ідэі за межамі сваёй кампаніі і ў той жа час аддаваць свае. Незапатрабаваныя распрацоўкі ў адной кампаніі таксама будуць перадавацца ўнутры кластара ў тыя інстытуты, дзе яны будуць больш неабходныя.

## СТАЎКА НА БІЯТЭХНАЛОГІІ

Па словах Ірыны Новікавай, беларускія навукоўцы ўжо правялі анкетаванне 268 арганізацый па чатырох групах пытанняў. Згодна з інфармацыяй анкет, у Беларусі сёння 5 арганізацый, якія знаходзяцца ў ядры шостага тэхналагічнага ўкладу. Іх сфера дзейнасці — ахова здароўя, біятэхналогіі. Гэта РНПЦ гігіены, НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі, Гродзенскі медуніверсітэт, Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі, НПЦ па матэрыялазнаўстве.

«Адзін з навукоўцаў НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі працаваў над ствалавымі клеткамі і атрымаў пэўны вынік, нягледзячы на спыненне фінансавання гэтых праектаў па ўсім свеце. Яго публікацыя мела шырокі рэзананс за мяжой, і, такім чынам, некалькі гадоў таму пачалася актыўная праца ў гэтым напрамку ў Беларусі», — адзначыла Ірына Новікава.

У нас таксама ёсць 8 арганізацый, якія адносяць сябе да пятага тэхналагічнага ўкладу. Сфера іх дзейнасці тычыцца аховы здароўя, біятэхналогій, сельскай гаспадаркі. Такім чынам, у межах краіны можна сфарміраваць сеткавы кластар арганізацый медыка-біятэхналагічнага профілю. Яны знаходзяцца ў розных абласцях краіны, але могуць каардынаваць сваю дзейнасць пры дапамозе інфармацыйных тэхналогій.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# «ЗЯЛЁНЫМ» ІНІЦЫЯТЫВАМ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

**Рэалізаваўшы маштабны праект па раздзельным зборы і сартаванні камунальных адходаў, які ажыццяўляўся Праграмай развіцця ААН і фінансаваўся Еўрапейскім саюзам, на Мастоўшчыне прадоўжаць работу ў сферы «зялёнай» эканомікі.**

Дзякуючы «смеццеваму» праекту ў раёне наладзілі дзейсную сістэму работы з цвёрдымі камунальнымі адходамі ў інтарэсах экалогіі, эканомікі і мясцовых жыхароў. У прыватнасці, абсталявалі шмат кантэйнерных пляцовак для раздзельнага збору пластыку, паперы, шкла, забяспечылі кантэйнерамі для перапрацоўкі біяадходаў (з атрыманнем кампосту) дамы прыватнага сектара, арганізавалі пункты для збору небяспечных адходаў. Усё гэта падмацавана новай тэхнікай і сучаснай станцыяй сартавання адходаў. Паводле ацэнкі дырэктара раённага прадпрыемства ЖКГ Сяргея Фралова, мастаўчане ўвогуле зацікаўлена ставяцца да справы раздзельнага збору адходаў. А выгада хаця б у тым, што значна павялічылі нарыхтоўку другасных матэрыяльных рэсурсаў. Калі ў 2008 годзе ў разліку на аднаго жыхара раёна іх збіралі 5,3 кілаграма, то сёлета гэты паказчык складзе каля 35 кг. Дзякуючы перапрацоўцы адходаў у раёне ўжо закрылі 18 міні-палігонаў.

Наперадзе — новы праект «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай эканомікі», які неўзабаве стартуе і таксама атрымае фінансавую падтрымку Еўрасаюза. У адным з яго кірункаў, які тычыцца водных рэсурсаў, будзе ўдзельнічаць і Мастоўшчына. Прадугледжана дыспетчарызацыя і аўтаматызацыя сельскіх водазабораў з вывадам інфармацыі на цэнтральны дыспетчарскі пульт у райцэнтры.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Здарэнне

# ВОХ, НЯЛЁГКАЯ ГЭТА РАБОТА...

Рыбака цягнулі з гразі больш за дзве гадзіны

**У Ганцавіцкім раёне мясцовым ратавальнікам давялося праводзіць аперацыю па выратаванні рыбака... з гразі. Небарака загразў адной з сажалак рыбгаса «Лактышы». Там папярэдне спусцілі ваду. Калі двое таварышаў зразумелі, што трэці не зможа выбрацца самастойна, яны патэлефанавалі на «101».**

Прыбыўшы па выкліку, ратавальнікі з аддзяленняў Лактышы і Агарэвічы з дапамогай дошкі, лесвіцы-палкі, іншых прыстасаванняў з вялікай цяжкасцю дабраліся да небаракі па глеістым дне. Потым супрацоўнікаў МНС разам з рыбаком паступова выцягвалі за вяроўку яшчэ сем чалавек. На ўсё спатрэбілася больш за дзве гадзіны.

Як паведаміў **супрацоўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ**, выратаваны 54-гадовы мужчына з прыкметамі ахаладжэння ад шпіталізацыі адмовіўся. Ён пагрэўся ля агню, пасля гэтага таварышы паспяшаліся забраць яго дадому. Усе трое гора-рыбакоў былі нападдітку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Трагедыя ў небе

# СЯРОД ЗАГІНУЛЫХ — БЕЛАРУС



**На борце авіялайнера, што разбіўся ў Егіпце, знаходзіўся адзін грамадзянін нашай краіны.**

Пра гэта паведамляе Міністэрства замежных спраў Беларусі са спасылкай на Пасольства Беларусі ў Егіпце. Інфармацыю пра гібель суайчынніка пацвердзіў **прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК.** Прозвішча загінулага не паведамляецца, аднак можна меркаваць, што гэта Раман Серадзінскі, чые даныя ў спісе пасажыраў запісаны ў беларускай транскрыпцыі.

28-гадовы хлопец родам з Клічава, вучыўся ў Магілёўскім сельскагаспадарчым тэхнікуме на факультэце механізацыі сельскай гаспадаркі. Паводле інфармацыі са старонкі ў адной з сацыяльных сетак, пасля заканчэння вучобы малады чалавек пераехаў у Санкт-Пецярбург, дзе працаваў грузчыкам-экспедытарам, прадаўцом і кладаўшчыком.

Акрамя таго, СМІ паведамляюць, што ў самалёце былі два этнічныя беларусы, якія не мелі грамадзянства нашай краіны. Гэта сужэнцы Аляксандр і Ала Радлевічы, якія паходзяць з Беларусі, але пражывалі ў Санкт-Пецярбургу. Мужчыну было 59 гадоў, яго жонцы — 56.

Крушэнне самалёта Airbus 321 кампаніі «Кагалымавія», што выконваў рэйс Шарм-Аль-Шэйх — Санкт-Пецярбург, адбылося 31 кастрычніка. Экіпаж не выйшаў на сувязь з Ларнакай і знік з экранаў радараў праз 21 хвіліну пасля ўзлёту. На борце знаходзілася 217 пасажыраў і 7 членаў экіпажа, ніводны з іх не выжыў. Прычыны катастрофы высвятляюцца.

1 лістапада ў Расіі быў аб'яўлены жалобным днём. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну, родным і блізкім загінулых Дзясяткі жыхароў беларускай сталіцы таксама выказвалі свае спачуванні сем'ям загінулых і прыносілі да будынка Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Мінску кветкі і лампадкі са свечкамі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by

• Тым часам

## НАШ ТУРЫСТ ЛЯТАЦЬ НЕ БАІЦЦА

**Нягледзячы на авіякатастрофу ў Егіпце, нашы суайчыннікі не адмаўляюцца ад паездак у гэты рэгіён. Аб гэтым паведамляюць прадстаўнікі айчынных турыстычных кампаній.**

У сумесным беларуска-егіпецкім турагенцтве «Тэхна Стар» адзначаюць, што цяпер адпраўка турыстаў адбываецца па раней зацверджаным графіку. «Сітуацыя з самалётам А321 на беларускіх турыстаў не паўплывала», — адзначылі ў кампаніі.

Прадстаўнікі турбізнесу звярнулі ўвагу, што некаторыя беларусы пры планаванні паездкі ў Егіпет аддавалі перавагу расійскім турфірмам і расійскім авіяперавозчыкам. «Магчыма, што асобныя турысты захочуць памяняць вылет з Масквы на вылет з Мінска. Увогуле, нейкіх узрушэнняў на беларускім турыстычным рынку гэтая сітуацыя выклікаць не павінна», — лічаць эксперты.

Тым часам авіякампанія «Белавія», чартарнымі рэйсамі якой карыстаюцца беларусы, заявіла, што працягне лятаць у Егіпет па ранейшых маршрутах. Як растлумачылі спецыялісты, змена палётаў еўрапейскіх авіякампаній тычыцца толькі транзітных маршрутаў, якія праходзілі над Сінайскім паўвостравам. Прамыя рэйсы з Еўропы ў Шарм-эль-Шэйх, Хургаду і іншыя егіпецкія гарады будуць выконвацца «Белавіяй» па ранейшых маршрутах, якія над Сінайскім паўвостравам не праходзяць.

# ПРЫЁМНЫЯ БАЦЬКІ ДЛЯ ПАЖЫЛЫХ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Адзінокіх старых да сябе прымаюць у асноўным сацыяльныя работнікі. Ёсць яшчэ і гасцявыя сем'і: чалавека запрашаюць у выхадныя дні, на святы. Гэтай паслугай ахоплена 12 пажылых жыхароў Вілейшчыны.

Адносіны ў такіх сем'ях рэгулююцца з дапамогай дагавора (своеасаблівая страхоўка). Ён заключаецца спачатку на год, потым падаўжаецца. У дакуменце прапісваюць правы і абавязкі прымаючага боку, умовы, на якіх будзе жыць стары. Вырашаюць, што рабіць з пенсіяй: пакідаць яе пажылому чалавеку ці цалкам перадаваць у сям'ю. Усё арганізуецца на дабрачынных асновах. «Прыёмныя бацькі» не атрымліваюць ніякага ўзнагароджання. Адзінае, што можа тэрытарыяльны цэнтр, — выпісаць прэмію сацыяльным работнікам, якія даглядаюць старых.

— Мы перыядычна наведваем прыёмныя сем'і, тры-чатыры разы на год, каб упэўніцца, што пажылым там жывецца добра і іх не крыўдзяць. Але стараемся людзям не надакучваць сваімі візітамі і праверкамі, — кажа Данута Антонаўна.

### «Хочацца дадому, але што там рабіць?»

На старэнькай «Ладзе» мы пад'язджаем да гарадскога шматпавярховіка. Тут, у кватэры на чацвёртым паверсе, жыве адна з прыёмных сем'яў для пажылых. Сацыяльны работнік Данута Кабак год таму забрала да сябе цётку. Перавезла з вёскі Сянюці, што ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці.

— Дзяцей у Соф'і Міхайлаўны няма, яна не была замужам, — кажа Данута Тадэвушаўна. — Адной у 78 гадоў даглядаць хату складана. Мы з мужам выбіраліся ў тую вёску, дапамагалі цётцы, але на такую адлегласць часта не наездзішся. Падумалі, што, калі возьмем яе ў Вілейку, і нам будзе спакайней, і ёй лепш. Мае дзеці ўжо жанатыя, вылецелі з бацькоўскага гнязда. Кватэра вялікая, месца хопіць усім. А дом, што ў Сянюцях застаўся, у добрым стане, мы ездзім, даглядаем яго. І цётку туды возім. Гэта ж яе радзіма, там людзі знаёмыя.



Соф'я Міхайлаўна не прывыкла сядзець без справы.

На пытанне «Ці засталіся ў Сянюцях сяброўкі?» Соф'я Міхайлаўна, невысокая хударлявая бабуля, адмахваецца: «Якія там сяброўкі? Адны старыя. Суседцы Тані часам тэлефаную. Працуюць там, як валы. Але ў суседкі дзеці ёсць, дапамагаюць».

Бабуля Зося сама да апошняга трымала карову. А некалі была вялікая гаспадарка: парасяты, куры, авечкі. Разам з братам даглядалі. І аднавяскоўцы сваіх не кідалі: калі трэба, і сена сушыць дапамагалі, і бульбу капаць.

— Па хаце не сумуеце?

— Хочацца дадому, — уздыхае старая, — але што там рабіць?

— А тут чым займаецеся?

— Хоць што калупаюся...

Участак, які аблугоўвае Данута Тадэвушаўна, знаходзіцца блізка ля дома, таму ў абед жанчына можа заскочыць праведаць цётку, пакарміць яе. «На работу, бывае, спяшаюся, накідаю посуду ў ракавіну. Прыходжу — усё памыта, прыбрана. Невялікая дапамога, а прыемна».

Бабуля паказвае нам свой пакой. На акуратна засланым ложку стаіць скрынка з ніткамі і пруткамі (пенсіянерка вяжа світар сваёй пляменніцы), насценны гадзіннік — адзінае, што Соф'я Міхайлаўна ўзяла са сваёй хаты. Акрамя рукадзелля, старая ў вольны час любіць пагаядзець тэлевізар — канцэрты і ток-шоу.

— Ведаю, многім пенсіянеркам падабаюцца перадачы пра суды, — расказвае Данута Раманоўская, якая разам з намі паехала праведаць сям'ю. — Заходзіш да іх, а яны нават не чуюць, прыліплі да экрана. Злуюся: «Да вас жа любы ў дом трапіць можа, вынесе ўсё». Бабулі толькі ўсміхаюцца: «У нас і красці няма чаго. Самае каштоўнае — мы самі».

**«Прыёмныя бацькі» не атрымліваюць ніякага ўзнагароджання. Адзінае, што можа тэрытарыяльны цэнтр, — выпісаць прэмію сацыяльным работнікам, якія даглядаюць старых.**

Па выхадных Данута Тадэвушаўна ездзіць з мужам у вёску, дзе жылі бацькі. «І цётку Зосю з сабой забіраем, — дадае жанчына. — Калі пытаемся ў яе, ці паедзе, адказвае: «Ну вядома, а што я адна буду! Куды вы, туды і я...» За той час, што працую сацыяльным работнікам, ужо нагледзелася на адзіноту. Не дай Божа застацца без сяброў і блізкіх! Гэта самае страшнае».

### «Бабуля перажывала, што абцяжарыць нас»

Наступны наш прыпынак — вёска Крывое Сяло. Едзем да сацыяльнага работніка Анатоля Баравога, які прытуліў сваю знаёмую. «Яўгенія Дзмітрыеўна — былая суседка, — распавядае пры сустрэчы Анатоль Іванавіч. — Памятаю яе, яшчэ калі ў школу хадзіў: мы ў Клоўсях (вёска Вілейскага раёна. — **Аўт.**) жылі на адным баку вуліцы. Потым пенсіянерка на абслугоўванні ў мяне была каля двух гадоў. Яе адзіная дачка ў Ліване. У інтэрнат для састарэлых Яўгенія Дзмітрыеўна не хоча ісці. А дома за ёй догляд патрэбны. Таму ўзялі да сябе».

Анатоль Іванавіч працуе сацыяльным работнікам ужо 15 гадоў. Успамінае, што заўсёды дапамагаў усім, хто звернецца. Каму тэлевізар адрамантуе, каму касу паправіць. Раней мужчына быў ветэрынарам пры калгасе. А потым гаспадарка развалілася. У гэты ж час жонка Анатоля Іванавіча Ірына пайшла з сацработнікаў у прыёмныя бацькі (жанчына дагадвала да 18 гадоў дваіх сірот, хлопчыка і дзяўчынку) і прапанавала яму сваё месца, бо людзі на ўчастку засталіся без падтрымкі. На абслугоўванні ў Баравога — сем населеных пунктаў. Да падапечных мужчына дабіраецца пешшу ці на веласіпедзе. Улетку па заяўках на матацыкле раз'язджае.

— Бабуля вельмі добрая, — хваліць старую гаспадыня Ірына Генрыхаўна. — Такіх і дзесяць глядзець можна. Сур'ёзна. Улетку, калі я ў гародзе корпаюся, унукі дапамагаюць (жанчына ківае на хлопчыкаў, якія ціхенька сядзяць на канапе і чытаюць кніжкі: на вакацыі прыехалі). Калі на вуліцы гарачыня і бабуля на двары хоча пасядзець, мы ёй крэсла выносім, парасон вялікі ад сонца ставім, каб не пякло. Яўгенія Дзмітрыеўна вельмі цёпла да мяне ставіцца. «Ты ж, — кажа, — мая мамка».



Усмешка на вуснах Яўгеніі Дзмітрыеўны з'яўляецца заўсёды, калі размова заходзіць пра яе дачку.

Фота Надзеі БУЖАН.

Старой аддзялілі ў хаце куток. Паставілі там ложак, столік, адгарадзілі тканінай, каб не перашкаджаць пенсіянерцы, калі тая адпачыць хоча. Тэлебачаннем Яўгенія Дзмітрыеўна не цікавіцца, затое радыё любіць паслухаць. Праўда, цяпер прыёмнік памянялі, старая не ведае, як новую тэхніку ўключаць.

— Бабуля перажывае, што будзе абцяжарваць нас, — прызнаецца гаспадыня. — Кажа: «Я ж бы табе што дапамагла, дай мне якую работу, а то сяджу, як клуха». Звычайна фасолю прапануем ёй палушчыць, а ў гэтым годзе не садзілі.

Увесь час, што мы гутарылі, 93-гадовая Яўгенія Дзмітрыеўна сядзела са слязьмі на вачах. Не ведаю, ці чула яна нас (пенсіянерка крыху глухаватая), але, напэўна, здагадвалася, чаму ў дом прыехалі карэспандэнты. Усміхацца старая пачала, толькі калі размова зайшла пра дачку. Роза пазнаёмілася з ліванцам у Мінску, калі той прыязджаў вучыцца. Выйшла за яго замуж, пераехала ў іншую краіну. І маці сваю туды забірала. Але Яўгенія Дзмітрыеўна доўга за мяжой не затрымалася: вярнулася праз паўгода ў родныя Клоўсі. Баіцца памерці ў далечыні ад дома. Дый тамтэйшай мовы старая не ведае. А сваццяз Лівана па-руску не размаўляе. Цэлы дзень сядзяць і маўчаць, глядзяць адна на адну, пакуль Роза з працы не прыйдзе, не перакладзе. Расказваюць, што да Яўгеніі Дзмітрыеўны там адзін удавец сватаўся, але яна жаніху адмовіла. «А што нам разам рабіць? — смяецца пенсіянерка. — Ён гергеча па-свойму, а я нічога не разумею».

У наступным чэрвені Роза павінна прыехаць у Беларусь. Пабудзе ў маці месяц, а то і больш. Старая ўжо чакае. «Бачылі б вы ўнука майго, — хваліцца нам Яўгенія Дзмітрыеўна. — Высокі, прыгожы хлопец».

...Прыёмныя і гасцявыя сем'і (іх у краіне 237 і 390 адпаведна) лічацца інавацыйнай формай уладкавання пажылых. Але насамрэч гэты варыянт падказвае само жыццё. Як мінімум прыёмныя сем'і ратуюць пенсіянераў ад інтэрнатаў, дзе тыя доўга не жывуць. Як максімум — падтрымліваць традыцыі клопату аб старэйшым пакаленні, сёння, на жаль, не вельмі папулярныя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Вілейскі раён.*

Ігуменскі тракт
№ 40 (141)

■ Шляхам герояў

# ЛАДАНКІ МАТЧЫНЫ ІХ ЗБЕРАГЧЫ НЕ ЗМАГЛІ

**Чатыры гады і тры месяцы працягвалася Першая сусветная вайна. У ёй удзельнічалі 38 краін. Больш як 10 мільёнаў жыццяў забрала гэтая бойня. Яшчэ каля 20 мільёнаў чалавек было паранена. На той час такіх ахвяр свет не ведаў. Днём заканчэння Першай сусветнай лічыцца 11 лістапада 1918 года, калі было падпісана Кампʼенскае перамірʼе, якое ўступіла ў сілу ў 11 гадзін раніцы. Менавіта гэты дзень ва ўсім свеце адзначаецца як Дзень заканчэння Першай сусветнай вайны, як Дзень памяці яе ахвяр і як Дзень прымірэння.**

Напярэдадні гэтай даты ў шосты раз у Вілейскім раёне прайшоў аўтапрабег, зладжаны Фондам памяці Першай сусветнай вайны «Крокі», якім кіруе Барыс Цітовіч. Сёлета ён звязаны са 100-годдзем вызвалення горада і раёна ад кайзераўскіх войскаў у ходзе Вілейскай аперацыі і ліквідацыі Свянцянскага прарыву. У ім прынялі ўдзел члены ваенна-гістарычных клубаў, школьнікі, ветэраны вайны ў Афганістане, казакі з Беларусі і Расіі, жыхары Вілейшчыны, краязнаўцы суседніх рэгіёнаў.

Аўтапрабег стартаваў 31 кастрычніка з цэнтральнай плошчы Вілейкі. Першы прыпынак — каля гарадскіх могілак на вуліцы 1 Мая, дзе нядаўна адкрыта брама-капліца ў гонар воінаў, што загінулі пры вызваленні Вілейкі ў 1915 годзе.

— Раней тут знаходзілася брацкая магіла. На жаль, час распарадзіўся так, што паверх яе цяпер — пахаванні свецкіх грамадзян. Але ў тым, што яны ляжаць разам, нічога страшнага няма, — распавёў Барыс Цітовіч. — Гэтая брама-капліца ўзведзена, з аднаго боку, у памяць тых, хто аддаў сваё жыццё за тое, каб мы сёння жылі ў міры ў нашых цудоўных гарадах, краіне. З другога — на сцены капліцы нанесена 286 імёнаў воінаў. Гэта імёны тых абаронцаў, пра якіх удалося даведацца ў ваенна-гістарычным архіве.

Пісьменнік Вячаслаў Бандарэнка неравнадушны да тых падзей стагодовай даўніны. Нядаўна ён прэзентаваў у вілейскім кінатэатры сваю кнігу «Паўночна-Заходні шчыт Расіі». Пісьменнік таксама выдаў серыю кніг аб Першай сусветнай вайне для моладзі.

— Роўна 100 гадоў таму ваколіцы Вілейкі вызвалялі часці, якімі камандаваў мой продак генерал-маёр Міхаіл Міхайлаў, — зазначыў Вячаслаў Бандарэнка. — Міхаіл Панцеляймонавіч атрымаў вельмі высокую ўзнагароду для свайго чыну — ордэн Святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра II ступені з мячамі. На жаль, як склаўся лёс майго сваяка, дзе ён пахаваны, я не ведаю. Вядома толькі, што ў канцы 1917 года ён быў жывы. І вельмі добра, што ёсць гэтая капліца. Лічу яе не толькі помнікам салдатам, якія аддалі жыцці за вызваленне Вілейкі, але і сімвалічнай магілай майго продка.

Старшыня раённага Савета дэпутатаў Наталля Радзевіч падкрэсліла, што ў Вілейцы шануюць памяць абаронцаў Айчыны. Нядаўна прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю з дня заканчэння вайны. У іх рамках адслужана памінальная літургія, дзе былі згаданы прозвішчы воінаў, што выбіты на браме капліцы. Адбылася і прэзентацыя некалькіх кніг, адна з якіх прысвечана падзеям Першай сусветнай. Асабліва адзначыла Наталля Аляксандраўна ўнёсак жыхароў раёна, працоўных калектываў у будаўніцтва капліцы.

На пліце змешчаны радкі верша паэта Уладзіміра Цануніна, прысвечаныя загінулым. У мерапрыемствах узяў удзел і сам Уладзімір Яфімавіч, які і зачытаў свой твор:

*...Вы адстаялі ад ворага спадчыну,*
*нашы лясы і палі*
*Пад гімнасцёркамі ладанкі матчыны*
*Вас зберагчы не змаглі.*

— Гэтыя воіны абаранялі не толькі рубяжы Айчыны, але і царкву Хрыстову, каб вораг не спаганіў яе. Няма лепшай памяці, чым малітва, звернутая да Бога аб заспакаенні душ нябожчыкаў — нашых продкаў, суайчыннікаў. І пакуль будзе гучаць малітва памяці, да таго часу будзе жыць іх свяшчэнны подзвіг у імя любові, веры, — звярнуўся да прысутных настаяцель прыхода айцец Аляксандр.

Пасля кароткай памінальнай малітвы (ліціі) удзельнікі аўтапрабегу рушылі далей. Прайшлі па памятных мясцінах Першай сусветнай, дзе ўсталяваны новыя помнікі і памятныя знакі: праз вёскі Любкі, Дварэц, Іжа, Рускае Сяло, Заброддзе.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Прызнанне

## ЗА КРАЯЗНАЎЧУЮ РУПЛІВАСЦЬ І ПОШУК НАРОДНАЙ ДУШЫ

**На Берасцейшчыне добра ведаюць публіцыста, празаіка, руплівага даследчыка гісторыі роднага краю Аляксандра Валковіча. У апошнія гады ён — і кіраўнік па-свойму ўнікальнага творчага праекта па выданні краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс», які заснаваны Брэсцкім райвыканкамам.**

Плённая творчая і грамадская дзейнасць нашага земляка адзначана і ўвагай замежных калег. Савет дырэктараў фонду «Spiritual Diplomacy» (ЗША) прыняў рашэнне аб прысуджэнні беларускаму пісьменніку Аляксандру Валковічу Першай літаратурнай прэміі «За высокі міжнародны прафесійны ўзровень у творах, якія садзейнічаюць этычнаму росту чытачоў і майстэрскаму паказу душы народа».

— Прэмія складаецца з грашовага ўзнагароджвання, спецыяльнай граматы, а таксама мы акажам дапамогу ў прыездзе лаўрэата ў ЗША, у штат Фларыда, — каменцірue сам факт узнагароджвання прэзідэнт фонду, добра вядомы ў Беларусі амерыканскі грамадскі дзеяч Майкл Маргуліс. — Пра рашэнне Савета фонду мы паведамляем у ПЭН-клуб пісьменнікаў, Бібліятэку Кангрэса ЗША, а таксама ва ўсе вядучыя ўніверсітэты і бібліятэкі Злучаных Штатаў Амерыкі.

Нагадаем, што Аляксандр Валковіч зʼяўляецца аўтарам кніг «Зубр белавежскі чыгунны», «Бяроза чорная — бяроза белая», «Алеся. Белавежскія сны» і інш. Творчасць пісьменніка з Брэста і раней уганароўвалася рознымі ўзнагародамі — Брэсцкай абласной літаратурнай прэміяй імя У. Калесніка, Рэспубліканскай літаратурнай прэміяй «Залаты купідон» і іншымі прэстыжнымі рэспубліканскімі і міжнароднымі адзнакамі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Духоўнасць

# ШТО ЧЫТАЎ РАДЗІВІЛ?..

### Пагартаць яго Біблію можна разам з Паўлам Харланчуком

**Сёлета мы адзначаем 500-годдзе з дня нараджэння ідэйнага бацькі беларускай Рэфармацыі — князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Гэты «некаранаваны кароль» Вялікага Княства Літоўскага, канцлер дзяржавы аднойчы вырашыў у сваім кіраванні абапірацца не на ўласную сілу, войскі і паплечнікаў, а на тое, што напісана ў Бібліі — акурат той кнізе, якую пры яго жыцці роднай мовай аддрукаваў Францыск Скарына.**

У гонар Чорнага сёння шмат дзе вісяць каляровыя інфармацыйныя шчыты, з партрэтам і датай нараджэння. Нацыянальным банкам выпушчана манета з яго выявай. Белпоштай зроблены адпаведныя канверты. Аднак кульмінацыяй ушанавання асобы стаў спектакль пад назвай «Біблія князя Радзівіла».

Андрусь Унучак адзначае, што сама зʼява Рэфармацыі надзвычай важная як для ўсёй Еўропы, так і для нашай краіны:

— 31 кастрычніка 1517 года Марцін Лютэр прыбіў да брамы Вітэнбергскага сабора 95 тэзісаў, накіраваных на рэфармацыю царквы. Можна сказаць, што яны зрабілі пераварот у рэлігійным, палітычным, культурным жыцці Заходняй Еўропы, у тым ліку Вялікага Княства Літоўскага. Гэта прывяло да нараджэння таго, што мы сёння называем еўрапейскай цывілізацыяй. Некаторыя краіны рэзка выйшлі наперад у сваім развіцці, іншыя засталіся крыху ззаду. Згодна з перакананнямі прыхільнікаў руху, царква павінна грунтавацца на Бібліі, але не толькі ў сваім унутраным жыцці, але і распаўсюджваць гэта на грамадскія зʼявы — эканоміку, палітыку. На нашу краіну Рэфармацыя таксама моцна паўплывала. Яна распаўсюдзілася ў XVI стагоддзі і, больш за тое, Рэфармацыя ў нас перамагла! Асноўная частка тагачасных кіраўнікоў дзяржавы сталі пратэстантамі. У заканадаўчым выглядзе зʼява знайшла сваё ўвасабленне ў Статутах Вялікага Княства Літоўскага — закон свецкі будаваўся на падставе закона Божага. Усё тагачаснае жыццё стала падпарадкоўвацца ідэям Рэфармацыі, яны мелі найбольшы ўплыў.





Галоўным рэжысёрам пастаноўкі выступіў знакаміты акцёр купалаўскага тэатра Павел Харланчук. Ён жа выканаў ролю самога князя. Сцэнарый пʼесы напісаў дасведчаны гісторык, вядомы даследчык дзейнасці газеты «Наша ніва», якая выходзіла ў пачатку XX стагоддзя, Андрусь Унучак. Папрацаваўшы з гістарычнымі крыніцамі, ён стварыў сюжэтную лінію і рэалістычна напісаў усе дыялогі (калі можна ўявіць сабе, як размаўлялі ў XVI стагоддзі).

Гэты рух закрануў усе сферы тагачаснага жыцця. Біблії пачалі перакладацца на нацыянальныя мовы, дзякуючы чаму сталі зʼяўляцца ўнармаваныя мовы еўрапейскіх краін (у тым ліку беларуская Біблія Францыска Скарыны). Была сфарміравана сістэма адукацыі (натуральна, каб чытаць новааддрукаваныя кнігі). Будавалася мноства храмаў. Падавалася, уся ўвага людзей была скіравана на «нябеснае», а не «зямное»... Аднак істотна павысіўся і матэрыяльны дабрабыт грамадства. Нездарма менавіта гэты час называюць «залатым векам Беларусі». Відавочна, што калі ўсё жыццё пабудавана на справядлівых законах Бібліі, гэта не можа не прывесці да росквіту.

Варта адзначыць, што спектакль прайшоў пры аншлагах. Была зладжана нават угэтую анлайн-трансляцыя! І гэта пры тым, што большасць акцёраў зʼяўляюцца непрафесіяналамі. Верагодна, вырашальную ролю ў прыцягненні гледача тут адыграла наяўнасць найвышэйшай ідэі — таго, пра што варта марыць і да чаго варта імкнуцца...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

# ПАМАЛІЦЦА І ЎСПОМНІЦЬ



**Вёска Корань Лагойскага раёна. Каталіцкія могілкі гэтай вёскі звязаны з лёсам народнага паэта Янкі Купалы. У 1902 годзе тут пахаваны яго бацька Дамінік Ануфрыевіч Луцэвіч.**



**Івянец.**

**У першыя дні лістапада беларускія каталікі згадвалі сваіх памерлых: у нядзелю былі Усе Святыя, у панядзелак — Задушны дзень. Гарэлі ў храмах і на могілках тысячы свечак, прыходзілі на магілы родных некалькі пакаленняў. Ушанаваць памяць, памаліцца, проста ўспомніць, што гэтыя людзі жылі калісьці на зямлі...**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 20 (35) Вторник 3 ноября 2015 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц Издается с 26 апреля 2014 года

# ОСЕТР С ГОРЕЦКОЙ «ПРОПИСКОЙ»



Фото БЕЛТА.

**Рыбоводный индустриальный комплекс Белорусской государственной сельскохозяйственной академии в Горках был создан при кафедре ихтиологии и рыбоводства как учебная база для обучения студентов и подготовки специалистов рыбоводческой отрасли Беларуси и России. Кроме того, в комплексе фактически в промышленных масштабах занимаются выращиванием мальков радужной форели и других ценных рыб из икры. Хозяйство способно выращивать до 2 млн штук мальков в год. За девять месяцев 2015 года оно получило 820 млн рублей прибыли. С этого года специалисты начали изучать возможность промышленного разведения раков.**

НОВОСТИ СОЮЗА

## СПРАВЕДЛИВЫЕ ПРАВИЛА ИГРЫ

**В Астане прошла международная конференция по адвокатированию конкуренции в сфере промышленности на трансграничных рынках под председательством министра (члена Коллегии) ЕЭК Нурлана АЛДАБЕРГЕНОВА, организованная Евразийской экономической комиссией.**

В день создания Евразийского экономического союза появился и первый наднациональный антимонопольный орган, уполномоченный осуществлять контроль за соблюдением общих правил конкуренции на трансграничных рынках ЕАЭС. Кроме того, была разработана нормативная правовая база, в том числе и модельный закон «О конкуренции». В ходе обсуждения озвучивалось, что на данный момент в соответствующий закон Республики Казахстан имплементировано 90% норм модельного закона, Беларуси — 60%, России — 94%.

На трансграничном рынке услуг сотовой связи в роуминге жители государств — членов ЕАЭС сталкиваются с проблемой дороговизны услуг. Комиссией совместно с антимонопольными органами Евразийского экономического союза разработаны и внедряются принципы справедливого роуминга, с использованием которых крупнейшие операторы сотовой связи ЕАЭС начали активное снижение тарифов. Этому было посвящено расширенное заседание Подкомитета по конкуренции и антимонопольному регулированию.

Кроме того, в ходе конференции обсуждались предложения по развитию конкуренции и выравниванию тарифов при железнодорожном транзите в/из ЕАЭС, легализации параллельного импорта, а также других случаях недобросовестной конкуренции.

В рамках конференции был подписан Меморандум о взаимопонимании между Евразийской экономической комиссией и Службой по государственным закупкам Республики Корея. Документ предполагает развитие сотрудничества путем обмена информацией и опытом в сфере регулирования государственных закупок (в том числе электронных), по вопросам правового регулирования, технологий обеспечения, а также иных исследований. Также по итогам конференции была принята резолюция, определяющая дальнейшую совместную работу ее участников по адвокатированию конкуренции.

**Вероника ПУСТОВИТ.**

# ПОСЛЕ ЮНОСТИ

## Юбилейная — X Международная конференция Евразийского банка развития, посвященная вопросам евразийской интеграции, — вышла на обсуждение более конкретных проблем

**И это закономерно. Сама евразийская интеграция в 2015 году — это уже совсем иной уровень экономического сближения стран-партнеров. Комсомольская юность закончилась, мы вступили во взрослую жизнь, полную вполне взрослых проблем и требующую взрослых, ответственных решений. Примерно так охарактеризовал современный период формирования общей экономической зоны на постсоветском пространстве председатель правления Евразийского банка развития Дмитрий Панкин. Остальные участники форума соглашались, что очень важно трезво и объективно оценивать происходящее и принимать разумные, дальновидные и тщательно просчитанные решения.**

### В МИРОВОМ ТРЕНДЕ

Ядром конференции стало пленарное заседание. Еще четыре секции были посвящены вопросам инфраструктурного развития, промышленной кооперации, сопряжения ЕАЭС и экономического пояса Шелкового пути и формирования общего финансового рынка.

«Страны, которые объединились в Евразийский экономический союз, полностью находятся в мировом тренде», — обратил внимание участников пленарного заседания **Андрей СЛЕПНЕВ, член Коллегии (министр) по торговле Евразийской экономической комиссии.** Если в 2005 году на планете действовало 180 региональных объединений, то сейчас их — 406, и эта цифра достаточно быстро растет.

«Совершенно очевидно, что ни модель национального протекционизма, ни модель всеобщей глобализации не дают устойчивой основы для развития торговли, производства и эффективной кооперации, — считает министр ЕЭК. — 15-летний безрезультатный путь по Дохийской повестке показывает, что перспективы многосторонней системы подтянуться под новые реалии туманны. Ответ очевиден — региональные многосторонние соглашения, которые будут обслуживать кооперационные цепочки, складывающиеся в рамках больших объединений».

Первые примеры — соглашения в регионе Тихого океана, Трансатлантики и... евразийского пространства. «Как только сформировался Таможенный союз, мы в первый год переломили тенденцию, когда взаимная торговля была менее активна, чем внешняя, — напомнил Андрей Слепнев. — На следующий год разница в темпах роста была уже трехкратная. И это при том, что структура торговли внутри союза была совсем иная: доля энергоносителей в два с половиной раза меньше, чем в структуре внешней торговли».

Это доказало, что в хорошие времена взаимная торговля между странами — региональными партнерами растет быстрее. Хорошие времена оказались недолгими, но и в тяжелые времена торговля внутри ЕАЭС падает медленнее, чем торговля с внешним миром, а ее структура продолжает улучшаться: больше появляется товаров инновационного характера, больше товаров с более глубокой переработкой, уменьшается доля минерального сырья. Все это происходит на фоне роста инвестиций в предприятия, ориентированные на общий рынок ЕАЭС.

«То, что бизнес свой выбор сделал (инвестиции делаются в расчете на общий рынок), — это позитивный сигнал, который говорит о том, что наши усилия по развитию интеграции нашли отклик в среде бизнеса, и я считаю это очень важным, — подчеркнул Андрей Слепнев. — Имею в виду, что интеграция должна быть не только на политическом уровне, но и на практическом».

### СЛАБЫЕ ЭКСПОРТНЫЕ АМБИЦИИ

ЕАЭС уже реализует единую торговую политику, это значит, что с внешним миром все пять стран говорят одним языком. Именно таким образом было заключено соглашение о зоне свободной торговли с Вьетнамом, где страны-члены выступили как единая сторона. Министр ЕЭК по торговле заметил, что Вьетнам предоставил условия для ЕАЭС лучше, чем кому-либо из других стран, с которыми имеет подобные соглашения. «И даже лучше, чем всем им, вместе взятым, — заметил Андрей Слепнев. — И в этом плане нашим предприятиям, конечно, надо реализовывать эти возможности».

**(Окончание на 2-й стр. «СЕ».)**

# ПОСЛЕ ЮНОСТИ

*(Окончание.*
*Начало на 1-й стр. «СЕ».)*

Однако еще на стадии переговоров о создании зоны свободной торговли с Вьетнамом ЕЭК столкнулась с тем, что у предприятий «пятерки» и их отраслевых ведомств экспортные амбиции развиты слабо. «Попытки получить развернутый экспортный запрос потребовали значительных усилий, — признался министр ЕЭК по торговле. — Крупные предприятия за редким исключением (про мелкие и средние и говорить нечего) не мыслят себя в глобальных трендах международной кооперации, не думают о том, что, например, выйдя на вьетнамский рынок, можно получить доступ к дешевому труду, который снизит издержки, если ты поставляешь комплектующие, более того, это выход на рынок АСЕАН, где очень большое потребление».

ЕЭК разработала ряд конкретных мер по поддержке экспорта. Речь идет, в первую очередь, о кредитной и страховой поддержке. Банки развития странчленов подписали соответствующий меморандум и приняли согласованное решение о разработке отраслевых программ поддержки экспорта по ключевым направлениям.

Совместно с научным сообществом и банками развития ЕЭК стремится увязать все меры поддержки экспорта на наднациональном и национальном уровнях с тем, чтобы они подтолкнули к выходу на внешние рынки средний бизнес.

## В СТОРОНУ ЛИССАБОНА

Говоря о среднесрочной программе действий ЕЭК по торговой политике и развитию отношений с ключевыми партнерами, член Коллегии по торговле заверил в готовности взаимодействовать с Европейским союзом. Главное препятствие здесь — низкий уровень доверия между двумя интеграционными объединениями. «Но планы продолжают оставаться актуальными. Зона от Лиссбона до Владивостока — это то, что поможет развиться и нашим экономикам и будет мощной превенцией конфликтов в зоне общего партнерства», — сказал Андрей Слепнев.

